# Жывая вада



Аўтары: Мядзведзева Крысціна Аляксандраўна 10 клас
Крывашэева Алёна Сяргееўна 10 клас
Язерская Настасся Міхайлаўна 9 клас
Абуховіч Дар'я Мікалаеўна 8 клас

Кіраўнік: Белавусава Святлана Сяргееўна
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
Сакольніцкага дзіцячага саду – сярэдняй школы

## Змест

Уводзіны ........ 1
Асноўная частка. Апісанне крыніц ........ 2-4
З успамінаў жыхаркі в. Хацілавічы Свірыдзенка Марыі Мікалаеўны ........ 5
З успамінаў жыхаркі в. сакольнічы Севасціцкай Лідзіі Федараўны ........ 6
Прыказкі пар ваду ........ 7
Прыкметы, звязаныя з вадой ........ 8
Што расказалі пра ваду жыхары вёсак ........ 9-10
Вада ў абрадах. Радзіны і хрэсьбіны ........ 11-12
Вада ў пахавальным абрадзе ........ 13
Вада ў купальскім абрадзе ........ 14
Заключэнне ........ 15
Літаратура ........ 16

## Уводзіны

З даўніх часоў і па сённяшні дзень у Беларусі шануюць азёры, ручаі і крыніцы. Асабліва шануецца крынічная вада, яе завуць "жывою" вадою, бо яна аздараўляе і ачышчае, як агонь. Вясною, пасля першага грому, людзі ідуць да крыніц памыцца і памаліцца. Ідуць у здаўна устаноўленыя дні: на Ю'я, Міколу, на Ўшэсце. Да першай пасля Тройцы "русальнай нядзелі" ваду бяруць толькі для піцця, а пасля купаюцца.

## Апісанне крыніц

У 2005 годзе членамі гуртка "Юны этнограф" былі даследаваны крыніцы ў в. Сакольнічы, Паклады, Хацілавічы і запісаны ўспаміны жыхароў аб вадзе.

Пад час экспедыцыі было ўстаноўлена:

У в. Сакольнічы на левым беразе ракі Добрасць на вуліцы Заходняй (Западная) знаходзіцца пяць крыніц.

1-я крыніца:

Знаходзіцца за агародам Аляксеенкі Наталлі Канстанцінаўны, глыбінёй 2,5 метры. Вада чыстая, празрыстая, вельмі смачная. Пастаўлена цэментная труба, ёсць драўляная двухсхільная стрэшка. Збоку зроблены сцек вады (праз металічную трубку).

2-я крыніца:

Знаходзіцца каля дома №8 Раманенкі Праскоўі Мартынаўны. Яе глыбіня 1,7 метра. Вада празрыстая, зроблена накрыўка.

3 і 4 крыніцы:

Знаходзяцца каля дома Булаўкінай Святланы Васільеўны. Абедзьве глыбінёй 2 метры. З адной крыніцы, зроблены сцёк вады праз металічную трубку. Вада ў гэтай крыніцы вельмі сцюдзеная. На смак прыемная, мяккая.



5-я крыніца:

Знаходзіцца каля дома Севасціцкай Марыі Фёдараўны. Крыніца знаходзіцца ў цэментнай трубе, зроблены сцек для вады. Есць драўляная двухсхільная стрэшка. Для зручнасці побач стаіць скамеечка, куды ставяць вядро. За 7 метраў ад крыніцы выкапана сажалка (пруд). Тут можна і купацца і паласкаць бялізну.

Каля дома Машковай Людмілы Віктараўны па вуліцы Садовая таксама ёсць крыніца. Глыбіня яе 2,5 метры. Відна, як б'юць ключы. Зроблены сцек для вады, двухсхільная стрэшка. Вада вельмі смачная. Крыніца знаходзіцца ў маляўнічым месцы. Побач растуць дрэвы вольхі. У час наведвання, каля крыніцы было шмат смецця. Вучні ачысцілі тэрыторыю ад бруду.

Ёсць крыніца каля дома Свадкоўскага Уладзіміра Мікалаевіча. Глыбіня – 1,5 метра. Кольца над паверхняй зямлі невысокае.

"Святая" крыніца знаходзіцца каля дома Аўрамавай Клаўдзіі Сцяпанаўны, на левым беразе Добрасці. Крыніца гэта існуе ўжо вельмі даўно.

Каля яе устаноўлены крыж і абразок. Крыніца ўзята ў металічную трубу, дыяметрам 1 метр. Зроблены сцёк для вады, есць ·накрыўка. Да крыніцы можна падыйсці з боку вуліцы

Зарэчная ці з вуліцы Цэнтральнай агародамі праз кладку. Глыбіня 1, 6 метра.



## З успамінаў жыхаркі вёскі Хацілавічы Свірыдзенка Марыі Мікалаеўны, 1928 г. н.

Была калісьці за вёскай Хацілавічы крыніца. Знаходзілася яна на беразе рэчкі Добрасць каля калінніка, гэта як ісці да Пушкароў. Называлі тую крыніцу святой. Людзі бачылі ў вадзе той крыніцы ікону з вобразам Божай маці, а некаторыя бачылі, як гэта ікона ператваралася ў рыбіну. Знайшоўся адзін з жыхароў, Іван яго звалі, які пайшоў да крыніцы з ружжом. Рыбіну тую страляць задумаў. Дамоў ён ад крыніцы не вярнуўся. Знайшлі яго там застрэленага. Людзі казалі, што гэта ікона тая яму адпомсціла. Ваду з той крыніцы людзі браць ператалі, так яна і заплыла, зарасла.

(Запісала Партнова Дзіяна 10 клас)

## З успамінаў жыхаркі вёскі Сакольнічы Севасціцкай Лідзіі Федараўны, 1935 г. н.

Крыніца тая, што "святой" называюць, існуе шмат гадоў. Мне зараз 71 год, а яна ўжо пры маіх дзядах была. З дзяцінства помню, што па ваду ездзілі, хадзілі ў тую крыніцу. Дужа смачная ў ёй вада. І на маёй памяці, было і такое, што ў час вайны (1941-1945 гг.) сюды прыязджалі набіраць ваду з Крычава немцы. Прыязджалі вельмі часта. Набіралі. Пілі. Пілі і ўсё хвалілі "Гут! Гут! Карашо!".

Калі людзі ішлі ў царкву на Хрышчэнне пасвяцаць ваду, то набіралі яе з гэтай крыніцы, ды і цяпер там набіраюць.

(Запісала Крывашэева Алена 6 клас)



## Прыказкі пра ваду

Няма смачнейшай вадзіцы, чым з роднай крыніцы.

Вада з гор – рыба з нор.

Калі на Стрэчанне певень нап'ецца вадзіцы – будзе ранняя вясна.

На Саракі пайшла зіма да ракі.

Красавіцкія ручаі зямлю ад снегу будзяць.

У красавіку вада на лузе – будзе сена ў стозе.

Красавік з вадою – май з травою.

## Прыкметы, звязаныя з вадой

Калі ад кропель дажджу на вадзе з'яўляюцца бурбалкі – да працяглай непагоды.

Калі ракі на бегаг выходзяць, а п'яўкі падымаюцца ў верх і вылазяць з вады – да непагоды.

Уюн падымаецца на паверхню вады, ротам хапае паветра – да непагоды.

Калі палонка на рацэ на вадохрышча (19 студзеня) да краёў вадой запоўнілася – чакай вялікай веснавой паводкі.

Ад Іллі (2 жніўня) вада ў рацэ халодная.



## Што нам расказалі пра ваду жыхары вёсак

Ваду Бог даў на патрэбу людзям. Людзі берагуць ваду. У яе нельга нічога кідаць і пляваць, каб Бог не пакараў. (Буянава Валянціна Іванаўна в. Хацілавічы).

Ёсць дзе-то на свеце "жывая" вада. Яна можа ажывіць нават мёртвага. Ёсць і такая вада, што лечыць любыя раны і ўсякія хваробы. Толькі найці тую ваду дужа трудна, таму, што яна на краю свету. Каб папасць туды, нада доўга ісці па дарозе, дзе засела нячыстая сіла. А засела яна для таго, каб не дапусціць чалавека да таго цуда. (Шаблоўская Праскоўя Іванаўна в. Хацілавічы).

Усяму жывому, ды і ўсім прадметам на свеце нада адпачываць. Вадзе ў рацэ таксама патрэбен адпачынак. На нейкі момант, у самую поўнач, яна перастае бегчы. Калі вада адпачывае, тады вельмі спрыяе і чалавеку, і скаціне (жывёле). (Несцярэнка Галіна Іванаўна в. Паклады).

Строга забараняецца пляваць у ваду. Старыя людзі казалі: "Ты сваёй маці ў вочы плюеш". (Несцярэнка Галіна Іванаўна в. Паклады).